


# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

ЛЮТЫ, 2019

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2


# НЯДЗЕЛЯ ПРА ЗАКХЕЯ

Дарагія браты і сёстры! Сёння, як штогод, святая Праваслаўная царква пачынае рыхтаваць сваіх вернікаў да велічнага перажывання Светлага Хрыстовага Уваскрасення. Зноў і зноў мы мусім прайсці шляхам Вялікага посту, прайсці праз суперажыванне Гасподнім пакутам у Страсной сядзьміцы і, у рэшце рэшт, акунуцца ў слаўную радасць Пасхі.

Як гэта нагадвае шлях нашага зямнога жыцця, дзе мы сустракаем шмат сумневаў, пакут і раздвоенасці, шмат выпрабаванняў і нягодаў і, у той жа час, адчуваем дабрыню і ласкавае святло Божага спрыяння! І менавіта тут мы атрымліваем радасны спадзеў паўнаты Божага Валадарства і вечнага жыцця з Богам. Але каб дасягнуць яго, трэба прайсці няпросты шлях пакаяння.

Сённяшняе чытанне распавядае нам пра мытніка Закхея, чалавека, які ў падабенства да іншых мытнікаў дзеля заробку пагадзіўся быць адлучаным ад супольнасці вернікаў. Але ў гэтым эпізодзе мы бачым яго не такім. Мы бачым яго чалавекам, які гатовы залезці на дрэва, каб пабачыць Хрыста. Чалавекам, які дзеля гэтага не баіцца

выглядаць смешным ці недарэчным. Чалавекам, якога ў гэты момант цікавіць толькі Хрыстос.

Вось з гэтага жадання пабачыць, сустрэць, пазнаць Хрыста і пачынаецца шлях пакаяння. Яно пачынаецца не з асэнсавання ці жалю за свае грахі, а менавіта з жадання быць з Хрыстом. І толькі потым — не найперш, а потым — узнікае праўдзівае жаданне разлічыцца са сваімі даўгамі і папрасіць прабачэння за пазыкі, якія не можам па чалавечай немачы аддаць Богу. Іуда таксама перажыў жаль за свой грэх. І куды яго прывёў гэты жаль без жадання быць са Хрыстом? У пятлю?

Вось пра гэта зноў і зноў нам нагадвае Царква, прапануючы перад Вялікім постам чытанне пра Закхея. Праўдзівае пакаянне пачынаецца з жадання бачыць Хрыста, з надзвычайнай зацікаўленасці Хрыстом. І толькі з гэтай надзвычайнай зацікаўленасці Хрыстом, прагі Хрыста можа прыйсці мудрасць і разуменне таго, як нам выправіць наш шлях і нашае жыццё так, каб жыццёвы шлях вёў у Божае Валадарства, а ні ў якім-небудзь іншым кірунку.

Будзем прасіць Госпада, каб Ён, паводле сваёй міласэрнасці, знайшоў нас, як некалі Закхея, годнымі Сваёй прысутнасці і Свайго Валадарства. Амінь.

**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода протаіерэя Ігара Галакава**
*Падрыхтаваў Аляксандр Спіцын*
**Дата выпуску: 10 лютага 2019 г.**